МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
«МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
імя А.А. КУЛЯШОВА»

І.М. Ячмянёва

# БЕЛАРУСКАЯ ПАЛЕАГРАФІЯ

Метадычныя рэкамендацыі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2008

УДК 930.27(476)(075.8)
ББК 63.2(2Б)я73
Я95

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета
МДУ імя А.А. Куляшова*

Рэцэнзент
старшы выкладчык кафедры беларускай і рускай моў
МДУ імя А.А. Куляшова
*В.М. Саўчанка*

**Ячмянёва, І.М.**

Я95 Беларуская палеаграфія: Метад. рэкамендацыі / І.М. Ячмянёва. — Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2008. — 16 с.

У выданні раскрываюцца прадмет, змест і задачы беларускай палеаграфіі як навуковай дысцыпліны, паказваецца сувязь яе з іншымі навукамі і навучальнымі дысцыплінамі, падаюцца звесткі з гісторыі станаўлення і развіцця данай дысцыпліны.

Прызначаецца студэнтам-філолагам, аспірантам і выкладчыкам філалагічных спецыяльнасцей.

**УДК 930.27(476)(075.8)**
**ББК 63.2(2Б)я73**

© Ячмянёва І.М., 2008
© МДУ імя А.А. Куляшова, 2008

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАДМЕТ, ЗМЕСТ І ЗАДАЧЫ ПАЛЕАГРАФІІ ЯК НАВУКОВАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Палеаграфія (ад грэчаскіх слоў palaios — старажытны і grapho — пішу) — дапаможная дысцыпліна гісторыка — філалагічнага цыкла, якая вывучае знешнія прыкметы рукапісных і друкаваных крыніц у іх гістарычным развіцці. Палеаграфія як навука ўзнікла ў Францыі ў пачатку XVIII ст. ў межах дыпламатыкі. Яе зараджэнне і ўвядзенне тэрміна «палеаграфія» звязана з імем бенедзікцінскага манаха Манфакона, які ў 1708 г. надрукаваў на лацінскай мове кнігу аб палеаграфічных асаблівасцях старажытнагрэчаскіх рукапісаў («Грэчаская палеаграфія»).

Палеаграфія як навуковая дысцыпліна дзеліцца на два галоўныя раздзелы: асноўны і дапаможны. Асноўны разглядае: 1) матэрыялы і прылады пісьма, куды ўваходзяць таксама пытанні аб разліноўцы, пераплёце і вадзяных знаках; 2) гісторыю почыркаў і асобных літарных знакаў ці накрэсленняў. Дапаможны раздзел уключае: 1) славянскія азбукі; 2) зводы; 3) вязь; 4) арнамент; 5) мініяцюру і іканапіс; 6) летазлічэнне; 7) апісанне рукапісаў.

Вывучэнне беларускай палеаграфіі, якая выдзелілася ў самастойную вучэбную дысцыпліну толькі ў пачатку 90-х гг. XX ст., адбываецца ў цеснай сувязі з такімі дысцыплінамі гістарычнага і лінгвістычнага напаўнення, як гісторыя беларускай літаратурнай мовы, беларуская дыялекталогія, гістарычная граматыка беларускай мовы, тэксталогія, эпіграфіка, сфрагістыка, нумізматыка, храналогія, археаграфія, архіўная справа, а таксама крыніцазнаўства у цэлым, паколькі палеаграфічныя прыёмы даюць матэрыял для знешняй крытыкі крыніцы.

Паводле сістэмы пісьма, алфавіта і мовы адрозніваюць палеграфію грэчаскую, лацінскую, славянскую, армянскую, арабскую, кітайскую і інш. Славянская палеаграфія ў залежнасці ад алфавіта, якім напісаны рукапісы, падзяляецца на кірыліцкую, глагалічную і лацінскую. Усходнеславянскія старажытныя рукапісы, як правіла, напісаны кірыліцай.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Асноўнай задачай палеаграфіі з'яўляецца: устанавіць час, месца,аўтарства, сапраўднасць рукапісу, выявіць падробкі. Датаванне па палеаграфічных прыкметах часам прыблізнае і можа хістацца ў радыусе ад некалькіх гадоў да стагоддзя. Больш дакладнымі з'яўляюцца палеаграфічныя вывады аб аўтарстве, месцы напісання і аўтэнтычнасці пісьмовых крыніц. Для таго каб навучыцца рашаць задачы палеаграфіі, неабходна авалодаць практычнымі навыкамі не толькі чытання рукапісных крыніц, але і назіранняў за ўсімі палеаграфічнымі прыкметамі ў цэлым.

Узровень сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця ў любую эпоху накладвае свой адбітак на стан пісьменнасці, вызначае яе асаблівасці і як бы «увязвае» паміж сабой знешнія прыкметы рукапісаў, якія служаць аб'ектам вывучэння палеаграфіі. Гэта дае падставы разглядаць палеаграфічныя прыкметы крыніц і методыку іх вывучэння ў цеснай сувязі з агульнапрынятай перыядызацыяй айчыннай гісторыі. У аснове палеаграфічнага метаду ляжаць назіранні над сукупнасцю палеаграфічных прыкмет (графікай літар, матэрыялам для пісьма, упрыгожаннямі, прыладамі пісьма і інш.) і выяўленнем іх адпаведнасці адзін аднаму для пэўнага перыяду часу. Адсюль палеаграфічны аналіз неадзельны ад гісторыі пісьменнасці і культуры ў цэлым. У асноўным палеаграфічны метад вызначэння часу напісання рукапісу падобны спосабу датавання прадметаў, знойдзеных пры раскопках археолагамі.

Развіццё палеаграфіі як навуковай дысцыпліны паступова прывяло да пашырэння храналагічных рамак палеаграфічнага даследавання рукапісных матэрыялаў. Калі раней палеаграфія займалася галоўным чынам вывучэннем рукапісаў да XIX ст., то ў цяперашні час ідзе распрацоўка метадаў палеаграфічнага аналізу пісьмовых крыніц XIX і XX стст.

Першапачатковыя прыёмы, якімі карыстаецца палеаграфія пры аналізе знешніх прыкмет рукапісаў, зарадзіліся на Русі, магчыма, ужо у раннефеадальны перыяд у сувязі з чыста практычнымі мэтамі: напісаць і аформіць дакумент, адрозніць арыгінал ад падробкі. Як адзначаў Л. Чарапнін, старажытныя рускія пісары ў пачатковым выглядзе прымянялі метады, якія многа пазней сталі разглядацца ў адпаведнай навуковай дысцыпліне.

У XVI — XVII стст. у галіне практычнай палеаграфіі робіцца крок наперад: з'явіліся спецыяльныя інструкцыі для пісараў-малявальшчыкаў, якія займаліся мастацкім афармленнем рукапісаў, а таксама



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

азбукі-пропісы, у якіх даваліся найбольш тыповыя варыянты графікі скарапісных літар.

Пераход ад практычнай палеаграфіі да палеаграфіі як навуковай дысцыпліны звязаны з развіццём гісторыяграфіі, выяўленнем і публікацыяй гістарычных крыніц. Работы рускіх гісторыкаў XVIII ст. М. Ламаносава, В. Тацішчава, Я. Балхавіцінава, К. Калайдовіча і інш. паставілі на чаргу дня пытанне аб неабходнасці развіцця палеаграфіі і намецілі ў агульных рысах шляхі яе развіцця.

Практычнае знаёмства з рукапісамі асабліва развілося сярод стараверау, што даказваюць «Паморскія адказы» пач. XVIII ст. А. Дзянісава. Падробка так званага «Соборнаго Дѣянія на еретика на арменина на мниха Мартина»быццам бы 1157 г. тут вельмі ўмела даказваецца чыста палеаграфічнымі меркаваннямі. Стараверскія начотчыкі М. Пятроў і Л. Федасееў на чале з А. Дзянісавым даказвалі, што «Дѣянія» больш позняга паходжання, бо 1) год у іх ідзе ад Нараджэння Хрыстова, а не стварэння свету, як у іншых старажытных рукапісах, н-д, у Зборніку Святаслава 1073 г.; 2) што ў гэтым помніку ёсць «предрѣчія», якія з'явіліся параўнальна нядаўна (з XVII ст.); 3) што помнік напісаны новым чарнілам беларускім скорапісам, хоць і на пергаменце, у многіх месцах які мае характар палімпсеста; 4) адзначаецца навізна ў пераплёце, спосабе сшывання лістоў, нітках; 5) дзеяслоўныя формы ўжываюцца больш позняга часу, а не стражытнага.

Распрацоўка славянскай кірылаўскай палеаграфіі пачынаецца толькі са з'яўленнем вядомага пісьма А. Аленіна графу А. Мусіну-Пушкіну пра надпіс на Тмутараканскім камені, знойдзеным на востраве Тамане ў 1792 г. У лісце пададзена шмат здымкаў з каменя, зробленых ў розныя часы і выдадзенымі рознымі спосабамі, таксама са старажытных рукапісаў, у першую чаргу са зборніка Святаслава 1076 г. Сачыненне напісана з поўным веданнем мэт палеаграфічных даследаванняў. Тут жа ўказаны далейшыя задачы рускай палеаграфіі. Акрамя гэтага, Аленін сабраў матэрыялы для гістарычнай славянскай азбукі па помніках пэўнага часу, малюнкі з розных помнікаў з надпісамі, шмат чаго пачаў друкаваць.

Палеаграфічныя заняткі Аленіна выдвінулі яшчэ аднаго працаўніка на гэтаў ніве Е. Ермалаева. З'яўляючыся хавальнікам рукапісаў Публічнай бібліятэкі, ён меў поўную магчымасць практычна азнаёміцца з імі, акрамя таго, у 1809 — 1810 г. Ермалаеў удзельнічаў у археалагічным падарожжы па Расіі, што садзейнічала таксама паве-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лічэнню яго палеаграфічных пазнанняў. Ермалаеў не пакінуў друкаваных прац па палеаграфіі, але затое практычна вучыў многіх наглядна адрозніваць, у які час напісаны рукапіс, і заўсёды ахвотна дзяліўся сваімі ведамі.

Да ліку вучняў Ермалаева належыць М. Карамзін, які ў сваіх заўвагах да «Гісторыіі Дзяржавы Расійскай» дае масу палеаграфічнага матэрыялу, з якога можна скласці вялікую кнігу пра старажытныя помнікі рускай пісьменнасці. У сваіх заўвагах Карамзін закранае ўсе галіны археалогіі: палеаграфіі, дыплапматыкі, нумізматыкі, сфрагістыкі і г.д.

Заслугоўвае ўвагі і дзейнасць К. Калайдовіча, аматара, знатака, шукальніка старадаўнасці. З яго выданняў, якія мелі значэнне для палеаграфіі, адзначым «Помнікі расійскай славеснасці XII ст., выдадзеныя з тлумачэннямі, варыянтамі і ўзорамі почыркаў» (1821 г.).; «Іаан, экзарх балгарскій» (1824 г.), сачыненне, у якім прыведзена мноства найважнейшых звестак са старажытнай пісьменнасці. Разам са П.Строевым, Калайдовіч выдаў «Поўнае апісанне славянарасійскіх рукапісаў, прыналежных бібліятэцы Ф. Талстога» (1825 г.). Да апісання прыкладзены палеаграфічныя табліцы почыркаў з XI па XVIII ст. Усяго 12 урыўкаў на 5 лістах.

Я. Балхавіцінаў, у далейшым мітрапаліт кіеўскі, нястомны рускі бенедзікцінец. Заслугоўвае ўвагі выдадзены ў 1818 г. у «Весніку Еўропы» (№ 15-16) разбор старажытнай Юр'еўскай граматы 1130 г. — першы дыпламатыка-палеаграфічны разбор рускага акта са здымкам.

Несумненна, больш за ўсіх важнае значэнне для палеаграфіі XVII — XVIII стст. мае дзейнасць А. Вастокава. Яго працы на царкоўна-славянскай і старажытнарускай мовах знаходзяцца ў цеснай сувязі з палеаграфіяй. У працы «Апісанне рускіх і славянскіх рукапісаў Румянцаўскага музеума» (1842 г.) аўтар, апісваючы той ці іншы помнік, удзяляе месца і палеаграфічным назіранням. У выданні Астрамірава Евангелля 1843 г., дзе ўвесь тэкст наўмысна падрыхтаванымі для гэтага літарамі надрукаваны «знак у знак, радок у радок, старонка ў старонку», пад славянскім тэкстам падаецца грэчаскі, у дадатку адзначаны апіскі пісара, разгледжаны граматычны лад мовы, дадзены поўны ўказальнік, прыкладзены здымкі. Нямала цікавых палеаграфічных назіранняў, асабліва якія датычацца абрысаў літар і іх лічбавага значэння, знаходзім у яго «Кграматыкі царкоўнаславянскай мовы, выкладзенай па старажытных пісьмовых помніках» (1863 г.).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Асабліва інтэнсіўна развівалася палеаграфія ў XIX — пач. XX ст. у Германіі, Францыі і Расіі ў сувязі з падрыхтоўкай і выданнем старажытных помнікаў.Вялікая роля ў распрацоўцы славянакірыліцкай палеаграфіі належыць І.І. Сразнеўскаму, А.І. Сабалеўскаму, К. Трамоніну, В.М. Шчэпкіну інш. Вучонымі была праведзена вялікая работа па збіранню і вывучэнню помнікаў пісьменнасці. Выданне крыніц суправаджалася назіраннямі над абрысамі літар, матэрыялам для пісьма, вадзянымі знакамі, упрыгожаннямі і іншымі палеаграфічнымі прыкметамі.

Дзейнасць К. Трамоніна для нас асабліва цікавая яго «Векапомнасцямі Масквы» (1843 — 1845 гг.). Кожны сшытак заключае ў сабе малюнкі рукапісаў, рэчаў, адзення, але больш навейшых. Варта таксама згадаць і аб кнізе даследчыка «Тлумачэнне знакаў, бачных на пісчай паперы, дзякуючы якой можна даведацца, калі напісаны ці надрукаваны якія-небудзь кнігі, граматы, малюнкі, карціны і іншыя старадаўнія і нестарадаўнія справы, на якіх не пазначана гадоў» (1844 г.). У працы падаецца 105 л. здымкаў, з 1493 нумарамі.

Бібліяграфічныя і археалагічныя даследаванні І. Сахарава пачаліся ў 30-я гг. XIX ст. Каштоўнасць уяўляюць яго працы: «Славянарускія рукапісы» (1839 г.), «Рускія старажытныя помнікі» (1842 г.). Акрамя таго ім складзены «Агляд славянарускага кнігадрукавання» (1849 г.), з якога з'явіўся толькі 4-ы выпуск. У працы даецца агляд старадрукаваных кніг, так што «Узоры славянарускага кнігадрукавання» з'яўляюцца як бы дадаткам да гэтага агляду.

Вядомы гісторык М. Пагодзін таксама ўнёс свой уклад у палеаграфію. У 1837і 1853 гг. у Маскве ім выдадзены «Рускія гістарычныя альбомы», якія змяшчалі подпісы розных гістарычных дзеячаў і часткова іх лісты. У 1840 — 1841 гг. ім выпушчаны «Узоры славянскага старапісання», два сшыткі, са змешчанымі ў іх 44 здымкамі, выкананымі мастаком Трамоніным. Ва ўзорах падаюцца почыркі розных рукапісаў ад старажытных да скарапісных. Шмат розных здымкаў з рукапісаў і надпісаў на іншых прадметах падаюцца ў яго творы «Старажытная руская гісторыя да-мангольскага перыяду» (1871 г.).

У 2-й пал. — апошняй чвэрці XIX ст. назіраецца пераход ад збірання і апісання асобных палеаграфічных прыкмет да абагульненых прац па палеаграфіі. У выдадзеных у 2-й пал. — пач. XX ст. працах І.І. Сразнеўскага, А.І. Сабалеўскага, Д. Празароўскага, В.М. Шчэпкіна, І. Шляпкіна і інш. змяшчаўся цікавы фактычны матэрыял і распрацоўваліся агульныя прыёмы палеаграфічнага даследа-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вання рукапісаў. Вялікая роля ў развіцці крыніцазнаўства і дапаможных гістарычных дысцыплін, у тым ліку і палеаграфіі, належыць Пецярбургскаму археалагічнаму інстытуту (быў адкрыты ў 1877 г.), з адкрыццём якога курс палеаграфіі ўвайшоў у пералік выкладаемых прадметаў.

Вядучы палеограф 2-й пал. XIX ст. акад. І. Сразнеўскі выдаў шэраг зборнікаў, сярод якіх асаблівае месца займаюць «Старажытныя помнікі рускага пісьма і мовы» (1863 г.) як вопыт храналагічнага ўказальніка помнікаў старажытнарускай пісьменнасці. У зборнік прыкладаецца атлас здымкаў. Другая вялікая праца даследчыка — «Старажытныя славянскія помнікі юсавага пісьма», дзе акрамя палеаграфічнага апісання ўсіх вядомых тады царкоўна-славянскіх помнікаў, напісаных кірыліцай, надрукаваны яшчэ значныя ўрыўкі з гэтых помнікаў (цалкам надрукавана Савава кніга), а таксама звесткі і заўвагі аб малавядомых і невядомых помніках. Сразнеўскаму таксама належаць і некалькі тэарэтычных артыкулаў па палеаграфіі, такіх, як «Палеаграфічныя даследаванні помнікаў рускай старажытнасці», «Агляд матэрыялаў для вывучэння славянарускай палеаграфіі», «Заўвагі аб рускім тайнапісе» і інш.

Літаграфічныя лекцыі па палеаграфіі, якія мелі некалькі выданняў і карысталіся вялікім попытам у тых, што цікавіўся гэтым прадметам, належаць знаўцу старажытных рукапісаў А.Сабалеўскаму. Так, акадэмік Сабалеўскі прааналізаваў моўныя асаблівасці смаленска-полацкіх грамат XIII — XV стст., выданняў Скарыны, паказаў уплыў старажытнай беларускай літаратуры на рускую, прывёў вялікі спіс старарускіх помнікаў з беларускімі рысамі або перакладзеных з беларускай мовы, вынікам чаго з'явіліся працы «Славяна-руская палеаграфія» (1908 г.), некалькі альбомаў палеаграфічных здымкаў з рукапісаў XII — XVII стст. (1901 г.), «Новы зборнік палеаграфічных здымкаў з рускіх рукапісаў XI — XVIII стст. (1906 г.). Пад яго рэдакцыяй выдадзены «Сказанне аб цудатворнай казанскай іконе... св. патр. Гермогена» (1912 г.) — фоталітаграфічны здымак і «Альбом здымкаў з кірылічных рукапісаў румынскага паходжання» (1916 г.). Акрамя таго, нямала палеаграфічнага матэрыялу можна сустрэць у яго «Нататках з гісторыіі рускай мовы» (1884 г.), дзе даецца і палеаграфічнае апісанне многіх рукапісаў.

Гаворачы аб выкладанні палеаграфіі ў Пецярбургскім археалагічным інстытуце, нельга не сказаць і аб дзейнасці І. Шляпкіна, які чытаў лекцыі з практычнымі заняткамі па рэчавай палеаграфіі. Вя-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

домы яго курсы: «Палеаграфія» (1905 — 1906 г.) і «Руская палеаграфія» (1905 — 1907 г.). Таксама Шляпкін сабраў вялікі матэрыял па надпісах: зрабіў здымкі, падрыхтаваў да іх клішэ і часткова надрукаваў.

У Маскоўскім універсітэце славянскую кірылаўскую палеаграфію ў 80-х гг. чытаў праф. М. Ціханраваў. Вядомы яго літаграфічны курс «Руская палеаграфія» (1889 г.) з дадаткам добра выкананых здымкаў і ўзорамі азбук. Усе з'явы рускай палеаграфіі тут разглядаюцца ў параўнанні з грэчаскімі, лацінскімі, заходнееўрапейскімі фактамі. Вельмі падрабязна выкладзена паходжанне палеаграфіі як навукі на Захадзе, дадзена правільная характарыстыка грэчаскага пісьма і г.д.

Вялікім знаўцам палеаграфіі ў Маскве быў і праф. В. Шчэпкін, які выдаў Сававу кнігу са здымкамі і даследаванне аб мове Балонскага псалтыра. Шчэпкін чытаў палеаграфію ў Маскоўскім універсітэце на Вышэйшых жаночых курсах, вынікам чаго з'явіўся яго арыгінальны «Падручнік рускай палеаграфіі» (1920 г.).

Дзейнасць Віленскай (1842, 1864 гг.) і Кіеўскай (1843 г.) археаграфічных камісій з'явілася зыходнай базай для палеаграфічных даследаванняў беларускіх і ўкраінскіх помнікаў пісьменства. Так, Віленская археаграфічная камісія выдала «Зборнік палеаграфічных здымкаў са старажытных грамат і актаў», захаваных у Віленскім Цэнтральным архіве і Віленскай Публічнай бібліятэцы (усяго 30 лістоў, 59 здымкаў). Віленскай Публічнай бібліятэкай выдадзена Тураўскае евангелле XI ст. — цудоўны літаграфічны здымак. Кіеўская камісія для разбору старажытных актаў выдала (пад рэдакцыяй І. Каманіна) «Палеаграфічны зборнік. Матэрыялы па гісторыі паўднёварускага пісьма XV — XVIII ст.» (1899 г.), а таксама «Уводзіны: Галоўныя моманты ў гісторыіі развіцця паўднёварускага пісьма ў XV — XVIII ст.».

Віцебская вучоная архіўная камісія па даследаванню старадаўнасці выдала тры выпускі зборніка «Полацка-Віцебская даўніна» (1911 — 1916 г.), апублікавала «Летапіс горада Віцебска», «Кароткі летапіс падзей, якія ўплывалі на лёс Віцебскай губерні», кнігі А.П. Сапунова «Полацкі Сафійскі сабор» (1888 г.), «Помнікі часоў старажытных і найноўшых у Віцебскай губерні» (1903 г.), М.Я. Нікіфароўскага «Старонкі з недалёкай даўніны горада Віцебска» і інш.

Пачынальнік беларускай палеаграфіі Я.Ф. Карскі ў сваіх працах вызначыў асноўныя заканамернасці змен абрысаў кірыліцкіх літар у старабеларускім пісьменстве ад XIV да XVII ст. Відазмяненні

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

літар ён разглядаў у сувязі з функцыяніраваннем на Беларусі розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма. Акрамя таго, Карскі правёў багаты дакументальны матэрыял з характэрнымі ўзорамі розных жанрава-стылявых разнавіднасцей айчыннага пісьменства. «Славянская кірылаўская палеаграфія» (1897 г.; другое выд. 1928 г.) Я.Карскага займае важнае месца ў вывучэнні беларускай палеаграфіі, паколькі закранае заканамернасці развіцця графічных форм літар, пісьмовых знакаў, шрыфтоў, таксама помнікі старажытнага пісьменства з мэтай прачытаць іх, вызначыць аўтара, час і месца стварэння, аўтэнтычнасць тэксту і інш.

Рукапісныя дакументы перыяду беларускай народнасці вывучалі таксама І.М. Даніловіч, І.І. Грыгаровіч, М.В. Доўнар-Запольскі, А.П. Сапуноў, Дз.І. Даўгяла, А.І.Жураўскі, Л.М. Шакун і інш. На аснове назіранняў над многімі старажытнымі тэкстамі былі вызначаны характэрныя прыкметы бытаваўшых на беларускіх землях трох асноўных тыпаў пісьма — устава, паўустава і скарапісу, зроблена прывязка іх да пэўнага часу і месца.

Палеографы XIX — пач. XX ст. пакінулі вялікую спадчыну. Але многія іх работы ў цэлым характарызаваліся фармальным разглядам знешніх прыкмет крыніц паза іх сувяззю з гістарычнымі з'явамі і нават са зместам дакумента.

Сярод беларускіх лінгвістаў і гісторыкаў XX ст. неабходна выдзеліць такіх, як А. Антановіч, У. Анічэнка, А. Булыка, У. Свяжынскі і інш.

Беларускі мовазнавец А. Антановіч упершыню ўсебакова і глыбока даследаваў беларускія тэксты, пісаныя арабскім пісьмом. Яны пашыраюць наша ўяўленне аб старажытных помніках беларускага пісьменства, даюць многа карысных фактаў пра суадносіны беларускай літаратурнай і жывой гутарковай мовы на розных этапах развіцця, пра фанетычныя, граматычныя і лексічныя асаблівасці розных беларускіх народных гаворак.

Прафесар У. Анічэнка найбольш значныя працы прысвяціў гісторыі беларускай мовы, беларуска-ўкраінскім старажытным моўным сувязям, параўнальнай граматыцы ўсходнеславянскіх моў і беларускай лексікаграфіі. Выдаў са сваімі прадмовамі і навуковымі каментарыямі рукапісы помніка старой беларускай пісьменнасці «Александрыя» (1962) і зборніка XIX ст. «Беларускі казачны эпас» (1976). Анічэнка адзін са складальнікаў «Хрэстаматыі па гісторыі беларускай мовы» (1961 — 1962) і «Пісьменнік і мова» (1962).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А. Булыка даследаваў каля 180 свецкіх і рэлігійных, арыгінальных і перакладных помнікаў, старажытных беларускіх рукапісных і друкаваных кніг XIV — XVIII стст. Спецыяльныя артыкулы Булыка прысвяціў вывучэнню розных недаследаваных аспектаў мовы такіх буйных помнікаў беларускага пісьменства, як «Вісліцкі статут», «Статут Вялікага княства Літоўскага» і інш.

Палеаграфічныя і крыніцазнаўчыя даследаванні беларускіх лінгвістаў і гісторыкаў XX ст. паспрыялі таму, што беларуская палеаграфія выдзелілася ў самастойную вучэбную дысцыпліну (1995 г. філалагічны факультэт БДУ). Выйшлі вузаўскія падручнікі і дапаможнікі, у якіх у той ці іншай меры закраналіся праблемы беларускай палеаграфіі, такія як «Гістарычная граматыка беларускай мовы» Ф. Янкоўскага (1983 ), «Стараславянская мова» А. Каўруса, М. Круталевіча (2005), «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» Л. Шакуна (1984) і інш., палеаграфічныя даследаванні М. Улашчыка «Очерки по археографии и истоковедению истории Белоруссии феодального периода» (1973), М. Батвінніка «Азбука на ўсе часы» (2003), С.Я. Куль-Сяльверставай «Беларуская палеаграфія» (1996), В. Несцяровіча «Старажытныя рукапісы беларускіх татар. Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія» (2003) і інш., артыкулы М. Прыгодзіча «Азъ глаголю вамъ...» (Роднае слова, 2003 — 2004), складзена вучэбная праграма па беларускай палеаграфіі для вышэйшых навучальных устаноў (складальнік М. Прыгодзіч, 2006).

Такім чынам, сучасная палеаграфія характарызуецца новымі метадалагічнымі падыходамі. Асноўным момантам метадалагічнага парадку з'явілася ўсё большае пранікненне гістарызма ў галіну палеаграфіі. Гэта значыць, што палеаграфічныя вывады ўсё больш дапамагаюць не толькі ў рашэнні пытанняў знешняй крытыкі крыніц, але і ў атрыманні вывадаў, звязаных з сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і культурнай гісторыяй, займаюць важнае месца ў сістэме пазнання чалавекам інтэлектуальнай спадчыны шматлікіх пакаленняў, дазваляюць вызначыць адметнасці гісторыі беларускага пісьменства, уклад беларускіх асветнікаў у сусветную скарбніцу гісторыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

*Мэты, задачы:* вызначыць адметнасці гісторыі беларускага пісьменства, уклад беларускіх асветнікаў у сусветную скарбніцу культуры, практычна засвоіць напісанае ў старажытнасці і ў нашы дні, выпрацаваць навыкі аналізу кніжных і рукапісных тэкстаў з пункту гледжання іх упрыгажэнняў, стыляў пісьма, зменлівасці графічных знакаў.

| № тэмы | Назва тэмы | Назва пытанняў, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (гадзіны) | | | | Наглядныя і метадычныя дапаможнікі | Кіруемая самастойная праца студэнта | | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | лек. | практ. (семінар.) | лаб. | інд. праца | | змест | гадзіны | |
| 1. | Уводзіны | Прадмет і задачы палеаграфіі. Сувязь палеаграфіі з сумежнымі гісторыка-філалагічнымі дысцыплінамі. Славянская палеаграфія (глагалічная і кірылаўская). Беларуская палеаграфія як асобная гісторыка-філалагічная дысцыпліна. | 2 | | | | | | | Гутарка |
| 2. | Палеаграфічныя даследаванні ў Еўропе і ва ўсходніх славян. | Б. Манфакон і яго «Грэчаская палеаграфія». Палеаграфічныя даследаванні ў Расії. Працы А.Аленіна, М.Ламаносава, Е.Ермалаева, Ф. Буслаева, А.Сабалеўскага і інш. | 2 | 1 | | | | | | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Працяг табл.*

| № тэмы | Назва тэмы | Назва пытанняў, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (гадзіны) | | | | Наглядныя і метадычныя дапаможнікі | Кіруемая самастойная праца студэнта | | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | лек. | практ. (семінар.) | лаб. | інд. праца | | змест | гадзіны | |
| 3. | Беларуская палеаграфія | Палеаграфічнае апісанне і выданне помнікаў старабеларускага пісьменства XIV – XVII ст. І. Даніловічам, І. Грыгаровічам, М. Доўнар-Запольскім. Я. Карскі і яго «Славянская кірылаўская палеаграфія». Палеаграфічныя даследаванні беларускіх лінгвістаў і гісторыкаў XX – XXI ст. | 2 | 1 | | | | | | |
| 4. | Славянскае пісьмо | Гісторыя ўзнікнення першай славянскай азбукі. Глаголіца і кірыліца, іх асаблівасці і змяненні ў гісторыі развіцця літаратурных моў славян. | 2 | 2 | | | хрэстаматыя | | | Праверка канспектаў |
| | | Рэфарматарская дзейнасць Ф. Скарыны і І. Капіевіча, станаўленне «грамадзянскага алфавіта». Лацініца ў гісторыі беларускага пісьменства. Кітабы як моўна-графічны фенамен ў гісторыі бел. мовы. | 2 | | | | | | | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Працяг табл.*

| № тэмы | Назва тэмы | Назва пытанняў, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (гадзіны) | | | | Наглядныя і метадычныя дапаможнікі | Кіруемая самастойная праца студэнта | | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | лек. | практ. (семінар.) | лаб. | інд. праца | | змест | гадзіны | |
| 5. | Матэрыялы і прылады пісьма | Матэрыялы пісьма: папірус, пергамент, папера. Берасцяныя граматы. Надпісы на прадметах матэрыяльнай культуры. | 2 | 1 | | | схемы малюнкі | | | Гутарка |
| | | Прылады пісьма старажытных пісцоў і перапісчыкаў. Сучасныя прылады пісьма. Працэс пісьма. | 2 | 1 | | | схемы | | | |
| 6. | Асаблівасці старажытнага пісьма | Дэкаратыўнае пісьмо. Вязь. Арнамент і яго віды. Вадзяныя знакі і іх паходжанне. | 2 | | | | хрэстаматыі ксеракопіі | | | Франтальнае апытванне |
| | | Тайнапіс. Мэты і асаблівасці тайнапісу. Віды сістэм тайнапісу. | 1 | 1 | | | | | | |
| | | Летазлічэнне. Сістэма летазлічэння ў славян, перавод і зверка дат. Суадносіны літар і лічбаў у глаголіцы і кірыліцы. | 1 | 1 | | | | | | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Канчатак табл.*

| № тэмы | Назва тэмы | Назва пытанняў, якія вывучаюцца на лекцыях | Заняткі (гадзіны) | | | | Наглядныя і метадычныя дапаможнікі | Кіруемая самастойная праца студэнта | | Формы кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | лек. | практ. (семінар.) | лаб. | інд. праца | | змест | гадзіны | |
| 7. | Стылі пісьма (почырку) | Асаблівасці ўстаўнога пісьма. Паўустаў.<br>Скарапіс. Мэты і тэхнічныя прыёмы скарапісу. Асаблівасці беларускага скарапісу ў параўнанні з маскоўскім. | 2<br>2 | 2<br>2 | | | хрэстаматыі<br>ксеракопіі | | | Гутарка |
| 8. | Палеаграфічныя асаблівасці старадрукаў | Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф.Скарыны, С. Буднага, В.Цяпінскага і інш. Шрыфт выданняў Скарыны.<br>Віленская друкарня братоў Мамонічаў. Палеаграфічныя асаблівасці «Статута ВКЛ 1588 г.» і інш. выданняў. | 2<br>2 | | | | збор-нікі<br>хрэстаматыі | | | Апытванне |
| 9. | Палеаграфічнае апісанне кніг і рукапісаў | Структура палеаграфічнага артыкула ў бібліяграфічных апісаннях кніг і старажытных рукапісаў. «Кніга Беларусі» як узор палеаграфічнага апісання старажытных кніг і рукапісаў. | 2 | 2 | | | хрэстаматыі | | | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЛІТАРАТУРА

### Вучэбная

1. **Каўрус А.А., Круталевіч М.М.** Уводзіны ў старaславянскую мову. — Мн., 1998.

2. **Каўрус А.А., Круталевіч М.М.** Стараславянская мова. — Мн., 2005.

3. **Кривчик В.Ф., Можейко Н.С.** Старославянский язык. — Мн., 1985.

4. **Круталевіч М.М.** Матэрыялы да лекцый па стараславянскай мове: Вучэбны дапаможнік. — Мн., 1995.

5. **Селищев А.М.** Старославянскнй язык. — Ч. 1, 2. — М., 1951 — 1952.

6. **Куль-Сяльверстава С.Я.** Беларуская палеаграфія. Гродна, 1996.

7. **Леонтьева Г.А.** Палеография. Хронология. Археография. Геральдика. — М., 2000.

8. **Леонтьева Г.А.** Палеография. — М., 1985.

9. **Лёвочкин И.В.** Основы русской палеографии. — М., 2003.

10. **Николаева А.Т.** Палеография. — М., 1980.

11. **Тихомиров М.Н., Муравьёв А.В.** Русская палеография. — М., 1966.

12. **Черепнин Л.В.** Русская палеография. — М., 1956.

13. **Щепкин В.Н.** Русская палеография. — М., 1999.

### Вучэбна-метадычная

14. **Прыгодзіч М.Р.** «Азъ глаголю вамъ...»: З гісторыі літар // Роднае слова. — 2003. — №№ 1-12; 2004. — №№ 1-2.

15. Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. — Ч. 1. — Мн., 1961; Ч. 2. — Мн., 1962.

### Навуковая

16. **Антонович А.К.** Белорусские тексты, писанные арабским письмом, и их графико-орфографическая система. — Вільнюс, 1968.

17. **Батвіннік М.** Азбука на ўсе часы. — Мн., 2003.

18. **Булыка А.М.** Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы. — Мн., 1970.

19. **Жуковская Л. П.** Тектология и язык древнейших славянских памятников. — М., 1976.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

20. **Карский Е.Ф.** Надпись Самуила 993 / У кн.: Карский Е.Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам. — М., 1962. — С. 569-603.

21. **Карский Е.Ф.** Листки Ундольского, отрывок кирилловского евангелия / У кн.: Карский Е.Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам. — М., 1962. — С. 565-568.

22. **Карский Е.Ф.** Славянская кирилловская палеография. — М., 1979.

23. **Клышка А.К.** Францыск Скарына, альбо як да нас прыйшла кніга. — Мн., 1983.

24. **Немировский Е.Л.** Путешествие к истокам русского книгопечатания. — М., 1991.

25. **Нікалаеў М.** Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X — XVIII ст. — Мн., 1993.

26. **Павленко Н.А.** История письма. — Мн., 1987.

27. **Черепнин Л.В.** Новгородские берестяные грамоты как исторический источник. — М., 1969.

28. **Шматаў В.Ф.** Беларуская кніжная гравюра XVI — XVII стагоддзяў. — Мн., 1984.

29. **Яскевіч А.А.** Старабеларускія граматыкі. — Мн., 1996.

## ЗМЕСТ

Прадмет, змест і задачы палеаграфіі як навуковай дысцыпліны. ............ 3

Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны ................................................ 12

Літаратура ........................................................................................ 16

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

*Ячмянёва* Ірына Мікалаеўна

# БЕЛАРУСКАЯ ПАЛЕАГРАФІЯ

Метадычныя рэкамендацыі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Рэдактар *Дз.А. Лаўшук*
Тэхнічны рэдактар *Г.М. Гладун*
Камп'ютэрная вёрстка *А.Л. Пазнякоў*
Карэктура аўтарская

Падпісана ў друк 6.02.2008 г.
Фармат 60x84/16. Гарнітура TextBook.
Ум.-друк. арк. 1,1. Ул.-выд. арк. 1,25. Тыраж 80 экз. Заказ №76

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова", 212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1
ЛИ № 02330/278 ад 30.04.2004 г.
Надрукавана на рызографе аддзела аператыўнай паліграфіі
УА "МДУ імя А.А. Куляшова"
212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1